## Білет 13

**Практычнае заданне.**
**Партызанскі рух і падпольная барацьба на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**
1. Як называўся орган, створаны для кіраўніцтва партызанскім рухам у тыле праціўніка?
2. Якія метады барацьбы рэкамендавалася выкарыстоўваць партызанам?
3. Аб выкананні якой задачы, што стаяла перад партызанамі, сведчыць картасхема?
4. Складзіце план адказу на пытанне: "Партызанскі і падпольны рух - важны фактар перамогі СССР у Вялікай Айчыннай вайне".

**I. З Пастановы Дзяржаўнага Камітэта Абароны** *(30 мая 1942 г.)*

1. У мэтах аб'яднання кіраўніцтва партызанскім рухам у тыле праціўніка і для далейшага развіцця гэтага руху стварыць пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання Цэнтральны Штаб Партызанскага Руху. <…>

3. У сваёй практычнай дзейнасці па кіраўніцтве партызанскім рухам Цэнтральны Штаб Партызанскага Руху павінен зыходзіць з таго, што асноўнай задачай партызанскага руху з'яўляецца дэзарганізацыя тылу праціўніка:

а) разбурэнне камунікацыйных ліній праціўніка (падрыў мастоў, псаванне чыгуначных шляхоў, арганізацыя крушэнняў цягнікоў, нападзенне на аўтамабільны і конны транспарт праціўніка);

б) разбурэнне ліній сувязі (тэлефон, тэлеграф, радыёстанцыі);

в) знішчэнне складоў, боепрыпасаў, амуніцыі, паліва і харчавання;

г) нападзенне на штабы і іншыя вайсковыя ўстановы ў тыле праціўніка;

д) знішчэнне матэрыяльнай часткі на аэрадромах праціўніка;

е) інфармаванне частак Чырвонай Арміі аб размяшчэнні, колькасці і перамяшчэннях войскаў праціўніка.

**II. Аб партызанскім і падпольным руху на акупіраванай тэрыторыі БССР** *(па матэрыялах вучэбных дапаможнікаў: «Гісторыя Беларусі. 1917 г. – пачатак XXI ст. 9 клас», «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны»)*

На акупіраванай гітлераўцамі тэрыторыі БССР разгарнуўся партызанскі і падпольны рух. 374 тыс. партызан і звыш 70 тыс. падпольшчыкаў вялі барацьбу за свабоду і незалежнасць сваёй краіны. Такога ўздыму партызанскага і падпольнага руху не ведала ніводная краіна Еўропы.

За тры гады гераічнай барацьбы ў тыле ворага беларускія партызаны і падпольшчыкі знішчылі больш за 500 тыс. гітлераўцаў, разграмілі 29 чыгуначных станцый, 948 штабоў і гарнізонаў, пусцілі пад адхон 11 128 эшалонаў і 34 бронецягнікі праціўніка; збілі і спалілі на аэрадромах 305 самалётаў, падбілі 1355 танкаў і бронемашын, знішчылі 939 вайсковых складоў.

У канцы 1943 г. партызанам удалося вызваліць і кантраляваць каля 60 % акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Тут ствараліся партызанскія зоны. Іх было больш за 20. У партызанскіх зонах усталёўвалася савецкая ўлада. У іх знаходзілі сховішча тысячы мірных жыхароў. Сяляне апрацоўвалі і засявалі зямлю. Працавалі школы і

бібліятэкі. Тут ішла падрыхтоўка да баявых аперацый, размяшчаліся аэрадромы, якія прымалі самалёты з «Вялікай зямлі».

Партызаны ўстанавілі пастаянны кантроль над рухам цягнікоў на самых буйных чыгуначных магістралях: Брэст — Гомель, Мінск — Орша, Мінск — Бабруйск, Полацк — Віцебск. Партызаны вялі «рэйкавую вайну»: узрывалі чыгункі і масты, выводзілі са строю паравозы і вагоны з мэтай дэзарганізацыі германскіх ваенных перавозак.

Вялікі ўклад у перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне ўнеслі падпольшчыкі. Патрыятычнае падполле вяло нелегальную дзейнасць на акупіраванай тэрыторыі, накіраваную на супрацьдзеянне палітыцы акупантаў. Так, напрыклад, дыверсійную дзейнасць на чыгуначным вузле Орша ўзначаліў былы начальнік паравознага дэпо Канстанцін Сяргеевіч Заслонаў. Патрыёты выраблялі міны, знешне падобныя на кавалкі вугалю, і падкідвалі іх у паравозныя топкі. Такім чынам заслонаўцы выводзілі са строю нямецкія цягнікі.

Партызанскі і падпольны рух у БССР быў адным з важных фактараў разгрому ворага, а Беларусь увайшла ў гісторыю як "партызанская рэспубліка".

## III. «Рэйкавая вайна» на акупіраванай тэрыторыі Беларусі (1943–1944 гг.)

